**Сухоцкая Т.Ф. (Мінск)**

## Парадыгматычная функцыя стылю ў мастацкай творчасці

Стыль – гэта фундаментальная, базавая каштоўнасць, якая фарміруецца бесперапынна ў працэсе культурагенезу. Нямецкі культуролаг О. Шпенглер у працы «Канец Еўропы» даводзіць, што менавіта стыль з'яўляецца ключавым для марфалагічнага разумення культуры, выяўлення яе ўласнай формы, ідэй, пачуццяў, жаданняў, волі, жыцця і смерці [3, с. 151]. Стыль, такім чынам, разглядаецца як рухомая і, разам з тым, устойлівая форма мастацкага самасцвярджэння, спосаб жыццядзеяння супольнасці.

Сваю энтэлехію – завершанасць – стыль атрымлівае ў мове, якая ў пэўнай ступені дзейнічае як суб'ект культуры, уплываючы на свядомасць. Нацыянальная літаратурная мова – гэта вышэйшы этап у культурагенезе, «адзежа душы», як трапна сказаў Ф. Багушэвіч. Па гэтай «адзежы» вызначаецца нацыянальнае аблічча культуры, яе самакаштоўнасць і ўнікальнасць – стыль. Дзеля самасцвярджэння ў міжкультурным дыялогу нацыя і асоба (супольны і індывідуальны суб'екты культуры) павінны абагуліць і сканцэнтраваць духоўны вопыт народа, ажыццявіць вербальнае выказванне ў форме імператыву, закона, сентэнцыі. Менавіта вербальнае выказванне афармляе нацыянальны стыль, закладзеныя ў ім інтэнцыі. У свой час вырашэнню праблемы такога выказвання шмат увагі аддалі І. Кант («Крытыка здольнасці выказвання»), М. Бахцін («Праблема тэксту ў лінгвістыцы, філалогіі і іншых гуманітарных навуках»). Такім чынам, мэтазгодна стыль культуры трактаваць як спосаб жыццядзеяння яе крэатыўных сэнсаў, сканцэнтраваных у структуры нацыянальнага тэксту і вербальнай сістэме яго кодаў. Стыль абумоўлівае і афармляе культурную парадыгму як норму, эталон. Калі парадыгма з'яўляецца рухомай нормай, то стыль мае заўсёды вельмі выразную накіраванасць свядомасці, у вызначэнні Э. Гусэрля – інтэнцыю [2, с. 358].

Асэнсаванае стаўленне да фарміравання стылю нацыянальнай культуры складае адметную рысу беларускага адраджэння. Менавіта адраджэнская культура павінна была даць узоры вырашэння праблем, уласцівых тагачаснай еўрапейскай культуры і прапанаваць арыгінальныя спосабы спасціжэння рэчаіснасці. Змест і парадыгма нацыянальнага стылю ў канцы XIX – пачатку XX ст. абумоўлены найперш ашчаджальным, ахоўным тыпам утапічнага мыслення, скіраванага на захаванне архетыпных асноў народнай культуры, сцвярджэнне радасці зямнога існавання, непрыняцце праяў крайняга рэвалюцыянарызму. Для беларускай культуры не з'яўляецца характэрным рэзкае размежаванне паміж суб'ектам і аб'ектам, паміж інтуітыўным і разумовым у сферы кагнітыўнай дзейнасці. У канцы XIX ст. заходнееўрапейская філасофія звярнулася да праблемы пераадолення разрыву паміж інтэлектуальнай і інтуітыўнай формамі пазнання. Рацыяналізм «без душы» вычарпаў сябе. А. Бергсон у працы «Творчая інтуіцыя» ўстанавіў сувязь паміж свядомасцю і інтуіцыяй. Айчынная гуманітарыстыка не заўважыла, што ў беларускай культуры не было такога разрыву, што культура заставалася сінкрэтычнай, бо адсутнічалі спрыяльныя ўмовы для развіцця філасофіі.

Адзін з фактараў фарміравання нацыянальнага стылю – моцнае ўздзеянне фальклорнай аксіялогіі. Стылёвай дамінантай у фальклоры з'яўляецца развіццё.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Р. Шырма убачыў у народных песнях вялікі патэнцыял. Ён надаваў шмат увагі мастацкай інтэрпрэтацыі фальклору, адчуваў патрэбу ў пошуках «новага жыцця» для здабыткаў народнай культуры. Актыўнае выкарыстанне беларускіх сюжэтаў, вобразаў традыцыйнай эстэтычнай сістэмы сёння не зводзіцца да простага механічнага пераймання. Жывая народная традыцыя ўзнімае на новы ўзровень не толькі мастацкую інтэрпрэтацыю, але і арыгінальную творчасць.

Праблема стылю займала адно з важных месцаў у культурнай праблематыцы газеты «Наша ніва». Для беларускай гуманітарыстыкі характэрным стала азначэнне «народны беларускі стыль», у якім бачыцца падкрэсленая ўстаноўка на абноўленае ўспрыняцце народнай культуры і сцвярджэнне віталізму. У артыкуле «Аб патрэбе стылю ў жыцці народа» В. Ластоўскі вызначыў змест гэтага паняцця як «развіццё нашай душы». Праграмнай устаноўкай «Нашай нівы» стала развіццё народных традыцый, увасабленне ў жыццё нацыянальнага стылю.

Стыль культуры «жыве» не толькі ў мастацкай культуры, але і ў сацыяльным жыцці. Такі стыль прадстаўнікі «Узвышша» называлі *аквітызмам* – «жывою вадой». Вытокі гэтага канатата, актуалізаванага ў свой час Я. Коласам, – у народнай культуры, дзе гаворка ідзе пра ваду не як форму быцця, з’яву анталагічную, а як першаэлемент жыцця. Гаворачы пра «беларускую жанравасць», узвышанцы таксама дбалі пра нацыянальны стыль. У іх праграме ён разумеецца як праграма дзейнасці.

Творчы вопыт М. Багдановіча ў поўным сэнсе можна ацаніць як узор развіцця нацыянальнага стылю, вытокі якога паэт бачыў у высокай культуры фальклорнага мастацтва і паэтычнай культуры беларускага селяніна, які чуйна ўспрымаў функцыянальную эстэтыку слова, вобразнасць, іншасказальнасць, уласцівыя народнай творчасці. М. Багдановіч па-наватарску пераасэнсаваў і выкарыстаў. Ён раіў: «…Пакуль мы робім першыя крокі, <…> трымацца народнай песні, як сляпы трымаецца плота…» [1, с. 290]. М. Багдановіч не зводзіў фальклярызацыю да стылізацыі, да «падробліваня» пад народную песню. Вартым і шырокім для творчасці ён лічыў шлях не простага запазычання скарбаў з народнай песні або яе імітацыі, а шлях стварэння новага, але ў «народным духу». Каб выявіць шлях у будучыню, трэба «і запраўды ўзяцца за вялікую працу: *развіццё беларускай народнай культуры* (вылучана аўтарам. – *Т.С.*)» [1, с. 288]. Беларуская культура нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст. змагла сфармуляваць сваё важкае слова ў агульнаеўрапейскім дыялогу, выкрышталізаваць парадыгму нацыянальнага стылю. У сучаснай сітуацыі, калі сталі актуальнымі пошукі новых спосабаў культуратворчай дзейнасці, духоўна-мастацкі вопыт папярэднікаў павінен быць улічаны.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.
2. Гуссерль, Э. Собр. соч. / Э. Гуссерль. – М., 2001.
3. Шпенглер, О. Закат Европы. Опыт морфологии мировой истории : в 2 т. / О. Шпенглер. – М., 1993. – Т. 1.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ